# ЛІТАРАТУРНАЯ СПАДЧЫНА ДЛЯ МОЛАДЗІ
## (з вопыту працы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры)

**Н. А. Яшкіна,** *ст. навуковы супрацоўнік*
*Дзяржаўнага музея гісторыі*
*беларускай літаратуры*

У лістападзе 2012 г. Дзяржаўнаму музею гісторыі беларускай літаратуры спаўняецца 25 гадоў. За гэты час музеем была праведзена вялікая збіральніцкая праца. У яго фондах захоўваецца звыш 50 тысяч адзінак музейных прадметаў, якія прадстаўлены ў калекцыях. Гэта старадрукаваныя і рэдкія выданні, кнігі, часопісы, рукапісы, эпісталярыі, друкаваныя выданні, фотадакументы, фоназапісы, археалогія, нумізматыка, адзенне і аксесуары, жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, этнаграфія, рэчы побыту і інш.

На падставе фондаў музея ствараюцца самыя разнастайныя выставы: літаратурна-дакументальныя, прымеркаваныя да юбілеяў выдатных дзеячаў беларускага пісьменства, тэматычныя, якія распавядаюць пра значныя падзеі ў гісторыі беларускай культуры. Музейная дзейнасць з'яўляецца неабходнай умовай фарміравання гістарычнай свядомасці падрастаючага пакалення.

Спецыфіка літаратурнага музея заключаецца ў тым, што ён патрабуе дастаткова падрыхтаванага наведвальніка. З гэтай нагоды шырока выкарыстоўваецца такая класічная форма працы, як экскурсія.

Сёння музей ідзе насустрач школе: распрацаваны цыклы лекцый, якія дапаўняюць школьную праграму па прадметах «Беларуская літаратура» і «Гісторыя Беларусі». Гэта форма працы, арганізаваная згодна з сучасным станам узаемазносін музея і, у прыватнасці, наведвальніка-вучня, дае магчымасць паказаць багатыя фондавыя калекцыі, дапамагчы вучням навучыцца абыходжанню з музейнымі прадметамі і, значыць, самастойнаму падыходу да звестак, утрымліваемых у іх.

Лекцыі па гісторыі беларускай літаратуры ўключаюць наступныя цыклы:

1. «Старажытная літаратура» – прадстаўлены такімі лекцыямі, як «Беларуская міфалогія» (5–7 кл.), «Старонкі літаратуры Сярэднявечча» (8–11 кл.), «Літаратура эпохі Адраджэння на Беларусі» (10–11 кл.), «Гуманізм і патрыятычны пафас паэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра» (8–11 кл.), «Біблія Францыска Скарыны і яе вытокі» (9–11 кл.), «Ад пісьма да кнігі» (5–7 кл.).

2. Цыкл «Беларуская літаратура XIX стагоддзя» ўключае наступныя тэмы: «Сцежкамі вялікага паэта (творчасць Адама Міцкевіча ў кантэксце гісторыі беларускай літаратуры)» (9–11 кл.), «Францішак Багушэвіч – пачынальнік беларускага нацыянальнага адраджэння» (9–11 кл.), «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Літаратурная і тэатральная дзейнасць» (9–11 кл.).

3. Цыкл «Беларуская літаратура XX стагоддзя» знаёміць з жыццём і творчасцю яркіх прадстаўнікоў беларускага пісьменства мінулага стагоддзя: лекцыя «Покліч» прысвечана літаратурнаму працэсу на Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. і ахоплівае такія постаці, як Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, Ц. Гартны, М. Чарот, М. Зарэцкі, У. Дубоўка, Я. Пушча, К. Чорны, А. Мрый (9–11 кл.).

У фондах музея захоўваюцца ўнікальныя матэрыялы з архіваў беларускіх пісьменнікаў, на падставе якіх распрацаваны наступныя лекцыі: «Васіль Быкаў. Жыццё і творчасць» (9–11 кл.), «Кандрат Крапіва. Пра сябе і свой час» (9–11 кл.), «Трывожнае шчасце пісьменніка» (І. П. Шамякін) (8–11 кл.), «Уладзімір Караткевіч. “Быў. Ёсць. Буду”» (9–11 кл.).

Створаныя электронныя прэзентацыі лекцый даюць магчымасць віртуальна гартаць старонкі гісторыі беларускай літаратуры.

Для пачатковай школы распрацаваны цыкл музейна-педагагічных заняткаў «Ля вытокаў фальклорна-этнаграфічнай спадчыны беларусаў», які арыентаваны на выхаванне вучняў у традыцыях народнай культуры, фарміраванне беражлівых адносін і любові да яе.

Фальклор – калектыўная творчасць народа, якая ўвабрала ў сябе яго векавы жыццёвы вопыт і веды. Зварот да фальклору мае сёння глыбокі сацыяльны сэнс, з’яўляецца сродкам эстэтычнага, маральнага і патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі.

Мудрасць і прастата, якія арганічна спалучаюцца ў фальклоры, дапамагаюць данесці да вучняў высокія маральныя ідэалы. Выхаванне любові да працы, міласэрнасці, цярпімасці, сумленнасці, павагі да старэйшых, клопат пра малодшых – запаветы ў народнай педагогіцы, якія з’яўляюцца своеасаблівым арыенцірам дадзенага цыклу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цыкл заняткаў, па сутнасці, адукацыйны: у даступнай і забаўляльнай форме для дзяцей малодшага школьнага ўзросту дае веды па вуснай народнай творчасці. Заняткі створаны з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей вучняў і накіраваны на развіццё эмацыйнай сферы. Як зазначае М. Юхневіч, «актыўнае засваенне музейнай інфармацыі ажыццяўляецца <…> у працэсе гульнёвай дзейнасці. Гульня ў жыцці малодшага школьніка застаецца вядучай формай пазнання. Менавіта ў гульні дзеці лепш засяроджваюцца і больш запамінаюць, у іх развіваецца здольнасць разумовага маніпулявання з прадметамі, абуджаецца творчы пачатак, развіваецца ўяўленне» [3, с. 128]. Метад гульні патрабуе ад педагогаў пэўных педагагічных намаганняў і майстэрства: высокага пачуцця адказнасці, цярплівасці, хуткай арыентацыі ў сітуацыі, здольнасці захапіць і зацікавіць вучняў, знайсці нестандартнае рашэнне і індывідуальны падыход. У занятках фальклорнага цыкла шырока выкарыстоўваецца метад пытанняў-адказаў, якi актывізуе самастойнасць мыслення, прыняцця рашэнняў, фармулёўкі вывадаў. Апроч гэтага, выкарыстоўваецца і метад тэатралізацыі, калі тэатральнымі сродкамі «аднаўляецца» той ці іншы абрад або свята.

Асноўнай формай працы гэтага цыкла выступаюць фальклорныя заняткі, мэта якіх – фарміраванне інтарэсу да беларускіх народных традыцый і абрадаў на аснове актыўнага ўдзелу ў сумеснай творчай дзейнасці вучня і музейнага педагога. Такім чынам, і на сёння музейна-педагічныя заняткі актыўна далучаюць вучняў да гістарычных, этнаграфічных і фальклорных каштоўнасцей, якія раскрываюць духоўнае багацце беларускага народа.

Менавіта фальклорныя заняткі заключаюць у сабе найбольшыя магчымасці ў стварэнні атмасферы абрадавага свята. Асноўнымі відамі дзейнасці вучняў на занятках фальклорнага цыкла з’яўляюцца: праслухоўванне, успрыняцце, гульні. Апроч гэтага, вучні, бадай што ўпершыню, знаёмяцца з народным календаром (па порах года), народнымі звычаямі і абрадамі.

Музейны педагог падчас занятку выкарыстоўвае музейныя прадметы, копіі, дублікаты і мадэлі даўніх рэчаў, якія вельмі цікавяць дзяцей; у музеі яны могуць узяць іх у рукі. Улічваючы спецыфіку музея, шырока выкарыстоўваецца такі фальклорны матэрыял, як запісы аўтэнтычных спеваў (напрыклад, вясельна-абрадавыя, калядныя, купальскія песні); загадкі, прыказкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прымаўкі, скарагаворкі. Гэта не толькі робіць занятак больш дынамічным, «жывым», але вострыць розум, дадае кемлівасці, самастойнасці разважанняў.

Музейна-педагагічныя заняткі фальклорнага цыкла разлічаны на вучняў пачатковай школы (1–4 класы) і працягваюцца не больш за 45 хвілін.

Да цыкла музейна-педагагічных заняткаў «Ля вытокаў фальклорна-этнаграфічнай спадчыны беларусаў» адносяцца ў першую чаргу тыя, якія аднаўляюць народныя святы беларусаў – Каляды, Гуканне вясны, Купалле – і знаёмяць з каляндарна-абрадавымі традыцыямі.

Абрады для дзяцей – гэта перш за ўсё сустрэча з казкай. Асабліва ў такіх музейна-педагагічных занятках, як «Ехала Каляда ў вазочку…» і «Купалле», падчас якіх ствараецца асаблівая казачная атмасфера. Гэта дасягаецца праз выкарыстанне вышэйзгаданых метадаў і форм музейнай працы: гульні, тэатралізацыі, пытанні-адказы, пераапрананні (у касцюмы персанажаў народных свят). Шырока ўжываюцца фальклорны матэрыял і музычнае суправаджэнне.

У беларускай мастацкай літаратуры даволі значнае месца займае тэма кахання і вяселля. Прыгадаем «Ідылію» В. Дуніна-Марцінкевіча, «Паўлінку» Я. Купалы, раман «Людзі на балоце» І. Мележа, раман у вершах «Родныя дзеці» Н. Гілевіча. Таму ў межах цыкла музейна-педагагічных заняткаў «Ля вытокаў фальклорна-этнаграфічнай спадчыны беларусаў» быў распрацаваны занятак на сямейна-абрадавую тэму – «Беларускае вяселле» для вучняў старэйшых класаў. Занятак пабудаваны на прыкладзе фальклорных запісаў вясельнага абраду Мядоцкага краю Барысаўскага раёна Мінскай вобласці і пераносіць аўдыторыю ў пачатак XX ст. У інтэрактыўнай форме адбываецца знаёмства з традыцыямі святкавання вяселля на Беларусі, падрабязна ўзнаўляюцца рытуалы, з якіх складаўся гэты старажытны абрад.

У рамках культурна-адукацыйнага праекта «Год роднай зямлі» аддзел навуковай асветы музея распрацаваў лекцыю этнаграфічнага характару «Наш нацыянальны касцюм», якая знаёміць з асаблівымі рысамі нацыянальнага адзення беларусаў.

Адной з галоўных задач педагогікі з’яўляецца працоўнае выхаванне. У народзе заўсёды лічылася, што праца – гэта фундамент існавання чалавека, а любоў да працы прывівалася з дзяцінства. Дзяцей вучылі на прыкладзе дарослых: перадавалі веды,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замацоўвалі пэўныя навыкі, выхоўвалі жаданне працаваць у паўсядзённым жыцці. Занятак «Як хлеб да нас на стол прыйшоў» для вучняў 2–4 класаў з’яўляецца спробай выкарыстаць у сучасных умовах прынцыпы народнага працоўнага выхавання. Ён праходзіць у форме казкі-гульні. Дзеці маюць магчымасць на ўласныя вочы пабачыць земляробчыя прылады (касу, серп, цэп, жорны і інш.), таксама даведацца пра тое, як апрацоўвалі зямлю, вырошчвалі збожжа, атрымлівалі зерне, муку і пяклі хлеб. Хлопчыкі спрабуюць сябе ў ролі «касцоў», а дзяўчынкі на некаторы час становяцца «жнеямі».

На працягу ўсяго дзяцінства блізкімі сябрамі і спадарожнікамі дзяцей з’яўляюцца цацкі. Гульня з імі дазваляе лепш пазнаваць навакольны свет, развівацца, выхоўваць густ. Занятак «Беларуская цацка» для 2–4 класаў знаёміць з беларускай традыцыйнай цацкай, музычнымі інструментамі, з якімі гулялі ў мінуўшчыну дзеці; далучае да вусна-паэтычнай творчасці народа.

Папулярнасць у навучальных установах ужо набыў занятак «Фэсцік. Гулянне ў народным стылі», разлічаны на вучняў пачатковай школы. Ён уяўляе сабой народнае музычнае мерапрыемства з гульнямі і конкурсамі. Распавядае пра беларускі кірмаш, дзе быццам бы і адбываюцца асноўныя дзеі: ствараецца музычны гурт, праводзяцца беларускія народныя гульні, якія рыхтавалі дзяцей да працы дарослых, арганізоўваецца эстафета (пры жаданні ўключаюцца выступленні слухачоў – вершы, песні).

Такім чынам, і самага маленькага наведвальніка, і вучня старэйшага ўзросту музей імкнецца далучыць да лепшых узорах багатай літаратурнай спадчыны беларусаў, каб спела ў новым пакаленні пачуццё чалавечай годнасці, павагі да сваёй краіны.

Маючы ўнікальныя фондавыя матэрыялы, выкарыстоўваючы сучасны навуковы патэнцыял і актуальныя метады працы, музейныя работнікі трымаюць адкрытымі славутыя старонкі нашай гісторыі і культуры.


1. *Музейная* педагогіка. Праблемы арганізацыі музейнай работы з дзецьмі: навук.-метад. зб. / уклад. В. У. Міронччык. – Мінск: БелІПК, 1997. – 71 с.

2. *Музейныя* сшыткі. Наша спадчына / уклад. Л. І. Ніжэвіч. – Мінск: БелДІПК, 2003. – 44 с.

3. *Юхневич, М. Ю.* Я поведу тебя в музей: учеб. пособие по музейной педагогике / М. Ю. Юхневич; М-во культуры РФ, Рос. ин-т культурологии. – М., 2001. – 224 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ